# Вобразы-імгненні дзяржавы

Да Міжнароднага дня роднай мовы сёлета розныя ўстановы падрыхтавалі свае імпрэзы. У шэрагу мерапрыемстваў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – фотавыстаўка «Беларусь: цудоўныя імгненні», арганізаваная бібліятэкай сумесна з тэлеканалам «Беларусь 24».

Наведнікі маюць магчымасць пабачыць серыю з 20-і здымкаў, што адлюстроўваюць сімвалы, прыроду, культуру нашай радзімы. Радзімы, якая паўстае прыгожай, разнастайнай і непаўторнай краінай са шматвекавой гісторыяй, помнікамі старадаўняй культуры і архітэктуры, сучаснымі будынкамі і наватарскімі ідэямі. Пабачаць наведнікі таксама жывёльны і раслінны свет, раўнінныя пейзажы, непраходныя лясы, запаведнікі і азёры.

Для краіны сімвалічныя жывёла зубр, птушка бусел, расліны валошка, лён і канюшына. З кожным сімвалам звязаныя свае легенды і паданні. Пра іх і распавядаюць у сваіх фотапрацах Ігар Бышнеў, Максім Вейзе, Юлія Войніч, Кацярына Міціна, Сяргей Плыткевіч, Улад Сакалоўскі, Сяргей Тарасаў. У кожным іх здымку – свае настрой, характар, гісторыя.

Сёлета цягам года выстаўка будзе экспанавацца ў розных краінах Еўропы. Збор фотавобразаў нашай краіны, мяркуецца, не пакіне гледачоў абыякавымі, а кожны вобраз-імгненне запоўніцца надоўга.

Арганізатары запрашаюць завітаць у галерэю «Лабірынт», каб да 15 красавіка на свае вочы пабачыць цудоўныя імгненні, зафіксаваныя фотамайстрамі.

***Паводле інфармацыі***
***аддзела сувязяў з грамадскасцю НББ***